# Школьны веснік

ДУА»Граўжышкоўскі яслі-сад-базавая школа»

, выпуск 2

Лістапад 2014


## 7 лістапада- дзень кастрычніцкай  рэвалюцыі

Перамога Вялікага Кастрычніка адкры-ла новую старонку ў сусветнай гісторыі, абвясціўшы прынцып права нацый на самавызначэне, яна стварыла нябачаныя раней магчымасці для нацыянальнага адраджэння, паскоранага сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця народаў. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя 1917 года стала адной з самых




значных падзей XX стагоддзя, якая карэнным чынам паўплывала на ход далейшай гісторыі. Людзі атрымалі права на працу, адукацыю, адпачынак, права ўдзель-нічаць у кіраванні краінай. Гэта пачуццё гаспадара, усведамлен-не сваёй прыналеж-насці да лёсаў краіны, магчымасць творчасці ў працы давалі нябачаныя вытворчыя вынікі, выклікалі энтузіязм і самаадданасць. Дзякуючы Кастрычніцкай рэвалюцыі беларускі народ набыў дзяржаўнасць, стварыў эканамічны і інтэлек-туальны патэнцыял, захаваў і ўзбагаціў нацыянальную культуру.Пры ўсёй неадназначнасці ацэнак рэвалюцыі, яна дапамагае лепш зразумець наша мінулае і разабрацца ў сённяшнім, паколькі ідэі аб'яднання і салідарнасці працоўных, роўнасці ўсіх людзей заста-юцца



## У школу з ахвотай…

Пачаўся новы навучальны год. Я ўжо вучаніца 4 класа. Гэта апошні мой год вучобы ў пачатковай школе. Кожны дзень я іду ў школу з радасным настроем. Я рада сустрэчы са сваімі сябрамі: Маргарытай, Дашай і Вікай. Мне вельмі хочацца закончыць гэты навучальны год на дзявяткі і дзясяткі. Асабліва мне падабаюцца ўрокі беларускага чытання, матэматыкі, музыкі, фізкультуры.

У вольны час я люблю маляваць і чытаць. Прыносяць задавальненне розныя гульні.

Мая мара – лячыць людзей ад розных хвароб. Калі я вырасту, стану ўрачом.

**Заблоцкая Дзіяна, вучаніца 4 класа**

## Акция «Миссия – жить»

Зачастую нам не хватает информации по медицинским и социальным аспектам наркомании, а у молодежи нет устойчивого понимания опасности потребления любых видов наркотиков. Поэтому мы приняли активное участие в проведении акции «Миссия – жить».




Вместе с педагогами школы ребята готовились к информационным и классным часам, собирали материал для изготовления коллажей и просматривали плакаты и картинки антинаркотической направленности для того, чтобы не стоит принимать нарко-тики».

Каждый знает, что вокруг должно быть всё чистым и красивым: наша школа, наш двор, наши классы и наши души. Поэтому в школе не осталось ни одного ученика, кто бы не поучаствовал в акции «Чистый двор, чистая школа, чистая душа».

Работа будет продолжена в рамках месячника «Остановись! За «кайфом – бездна!».

**Купчалойть Лена,**

**ученица 8 класса**

# Тыдзень інфарматыкі

Інфарматыка - ве-льмі сучасная вобласць ведаў. Мы вывучаем яе ў школе, як прадмет, але не толькі. Навошта патрэбна інфарматыка? У сучасным свеце мы кожны дзень сутыкаем-ся з найноўшымі тэх-налогіямі. У мяне дома ёсць камп'ютар, пад-ключаны да інтэрнэту. Калі я шукаю што-не-будзь у інтэрнэце або пішу сябру паведам-ленне, то выкарыстоў-ваю дасягненні інфар-матыкі.

Вакол нас - мора ін-фармацыі, а навука інфарматыка як раз вырашае пытанні, як кіраваць гэтым морам. Таму яна і носіць та-кую назву. Без дасягне-нняў інфарматыкі не існавала б камп'юта-раў, інтэрнэту і іншых новых тэхналогій, якія ўжо сталі для нас звык-лыя. Не было б нават вылічальных машын, якія могуць вырабляць складаныя разлікі за долі секунды. А разлікі патрэбныя ўсюды: на вытворчасці, у банках, на лініях транспарту. Жыццё было б нашмат складаней, калі б ін-фарматыка не раз-вілася да такога ўзроў-ню, як цяпер.

Не было б пошу-кавых сістэм, з дапа-могай якіх цяпер мож-на адшукаць патрэб-ную інфармацыю.



У школе прайшоў тыдзень "Інфарматыкі і фізікі". Тыдзень па-чаўся інфармацый-нымі гадзінамі ў 5-9 класах па навінах су-часных інфармацыйных тэхналогій. Вучні па-стараліся і агучылі вельмі многа цікавай інфармацыі. Дзеці вельмі старанна рых-таваліся да конкурса знатакоў "Ці ведаеш ты?", пераможцам стала Куп-чалойць Алена. Былі вельмі актыўныя ў кон-курсе Келдановіч Дар'я, якая ад пераможцы ад-стала на 0,5 балаў, а таксама Велямовіч Іна. Гульня "Шчаслівы выпадак" сабрала дзве каманды вучняў 6-9 класаў. Каманды змага-ліся за перамогу і з не-вялікім разрывам пера-

Усе вучні прынялі актыўны ўдзел у правядзенні тыдня і прыйшлі да высновы,што інфарматыку неабходна вывучаць, каб разумець, з чым яны сутыкаюцца кожны дзень, як гэта дзейнічае. Бо нездарма наш час называецца інфармацыйнай эпохай.

**Гайдукевіч Іван, вучань 7 класа**




**Купчалойць Алена, пераможца конкурсу знатакоў**

## Восеньскі парк

Нам вельмі пашанцавала, таму што побач з нашай школай есць парк . Восень у парку незвычайна прыгожая: рознакаляровае лісце летае над галавой, ціха падае на зямлю і шамаціць пад нагамі. Восеньскае лісты наогул не падобныя на летнія: зяленыя, жоўтыя, чырвоныя, бардовыя, карычневыя - яны могуць быць адначасова трохколернымі. Але праз некаторы час лісце пачынае чарнець і яго неабходна прыбіраць.

Прыбіраць тэрыторыю парка выйшлі вучні нашай школы. Усе стараліся працаваць стараннна. Праз гадзіну-другую усё лісце зграбілі ў кучы. Мы, вучні пятага класа, таксама старанна працавалі, зграбалі лісты.



Цяпер наш  парк чысты. Прыемна  пахадзіць і падыхаць свежым павертарм.

**Вучні 5  класа.**



# Смяшынкі-весялінкі



Мззгі без кнопкі

Бацька абурана крычыць на сына, які робіць у практыкаваннях адну памылку за другой: — Максім, ты можаш уключыць мазгі?

—Не. У мяне кнопачкі няма…

***

Пакамечаны сабака

Бацька з сынам ідуць з дзіцячага садка. Раптам бачаць мопса, якога выгульвае гаспадыня.

Сын: — Бацька, паглядзі, які сабака пакамечаны…

***

Міхась і настрой

– Ну як там мама, які ў яе настрой? – пытае бабуля ў Міхася.
– Усялякі бывае: і добры, і дрэнны.
– А добры – калі?
– Пасля дрэннага, – адказвае Міхась.

***

– А чаму вунь тая цётка ўсміхалася, а гэтая – не? – пытае Міхась у бабулі ў краме.
– Пэўна, настрой знік.
– Згубіўся?
– Відаць, што так.
– А яна яго знойдзе? – не адстае Міхась ад бабулі.

***

– Бабуля, чаму, калі я невясёлы, то і мама сумная? – пытае Міхась у бабулі.
– Затое яна радуецца тады, калі табе весела.
– Не, не радуецца. Бо калі я весялюся, то мама кажа: “Не дурэй!”.